**МОКРАЕ** (да 1968 г. вёскі Мокрае - 1 і Мокрае - 2) — вёска ў Бароньскаўскім сельскім Савеце (да 1994), за 42 км на ПдЗ ад Касцюковіч, 25 км ад чыгуначнай станцыі Бялынкавічы на лініі Крычаў — Сураж, 200 км ад Магілёва, на р. Свінка (прыток р. Бесядзь), на захадзе яе прыток — р. Каровіч, на ПнЗ мяжуе з лесам. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Крычаў — Сураж.

Вядома з 16 ст. як с. Мокрае ў Мсціслаўскім ваяводстве ВКЛ. У 1585 г. сяло, у Крычаўскай воласці, уласнасць казны. У 1604 г. у Крычаўскай «дзяржаве». Паводле інвентару Крычаўскага староства 1709 г. – 2 дымы, 1,5 валокі зямлі. У 1747 г. 10 дымоў. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1779 г. згадваецца як в. Мокрая, 55 жыхароў, у складзе маёнтка графа Р.А. Пацёмкіна. У 1785 г. дзейнічаў млын. У 1799 г. – 7 двароў, 53 жыхары, 6 значыліся ва ўцёках. вёска належала суддзі Гайкову, у Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні. У 1811 г. вёска, 35 сялянскіх душ мужчынскага полу, у складзе аднайменнага маёнтка, уладанне памешчыка Цеханавецкага. У 1816 г. 15 двароў, 74 жыхары. Па рэвізскіх матэрыялах 1834 г. – 109 жыхароў, уладанне Р.І. Галынскага. Паводле інвентара 1846 г. – маёнтак, 176 сялянскіх душ. Належаў памешчыкам Галынскім, якія мелі 2726 дзесяцін зямлі, сяляне мелі 307,5 дзесяцін. У 1855 г. у маёнтку быў заснаваны шкляны завод, на якім у 1864 г. працавалі 98 рабочых, даход складаў 11 тысяч рублёў. У 1858 г. – 20 двароў, 215 жыхароў, уладанне памешчыкаў Д .Г. Галынскага і Л.І. Беліковіча. Гаспадар маёнтка меў у вёсцы ў 1855 г. 3426 дзесяцін зямлі. Акрамя шклозавода (выпускаў ліставое шкло), быў вадзяны млын. Дзейнічала вапнавая вытворчасць. Частка вяскоўцаў займалася рамізніцкім промыслам. На 1880 г. вёска, 21 двор,175 жыхароў, у Машаўской воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. У 1886г. у маёнтку дзейнічалі ветраны і вадзяны млыны, шкляны завод. Паводле перапісу 1897 г. вёскі Мокрае - 1 (35 двароў 256 жыхароў, піцейны дом) і Мокрае - 2 (яна ж Іванаўка, 33 двары, 255 жыхароў). У пачатку 20 ст. адкрыта народнае вучылішча (у 1905 г. 37 вучняў). У 1909 г. у Мокрам – 1 – 35 двароў, 267 жыхароў, у Мокрам - 2 — 36 двароў, 269 жыхароў. На базе дарэвалюцыйнай школы створана і дзейнічала 4-х гадовая школа, для якой у 1930 г. пабудавана ўласнае памяшканне. З сакавіка 1924 г. у БССР, з 17.07.1924 г. у Бялынкавіцкім раёне. З 20.08.1924 г. – цэнтр сельскага Савета. У 1926 г. у в. Мокрае - 1 — 63, у в. Мокрае - 2 — 43 двары. З 04.08.1927 г. у Касцюковіцкім раёне. У 1931 г. створаны калгас, працавалі кузня, ваўначоска, 2 ветраныя млыны. У 1940 г. у в. Мокрае-1 – 71 двор, 324 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну ў верасні 1943 г. нямецка – фашысцкія акупанты поўнасцю спалілі вёску. Вызвалена 29.09.1943 г. 179 вяскоўцаў загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе. У памяць аб іх у скверы пастаўлены абеліск.








Пасля вайны вёска адбудавалася. Паводле перапісу 1959 г. – 468, у 1970 г. – 379 жыхароў. У 1986 г. – 78 гаспадарак, 220 жыхароў, у складзе саўгаса «Зарэчны» (цэнтр — в. Вялікі Бор). Працавалі сярэдняя школа, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб, магазін, аддзяленне сувязі, 3 спартыўныя пляцоўкі. Рака Свінка падзяляе вёску на паўночную (крывалінейная вуліца, арыентаваная з ПдЗ на ПнУ уздоўж ракі) і паўднёвую (планіроўка Г-падобная) часткі. Забудавана пераважна двухбакова, драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. Грамадскія будынкі ў паўднёвай частцы. Радзіма беларускага паэта, празаіка Майсея Ларывонавіча Сяднёва.


М.Л. Сяднёў

У сувязі з радыяцыйнай забруджанасцю пасля чарнобыльскай катастрофы жыхары (78 сямей) перасялены ў 1991 г. у в. Крапіўня.